**Аверкава Н.К.,***выкладчык*

# ПРАБЛЕМА ІМПРАВІЗАЦЫІ Ў РАЗМОЎНЫМ ЖАНРЫ

У сістэме духоўных каштоўнасцей грамадства значную ролю адыгрываюць народныя святы, якія з'яўляюцца актыўнай формай уцягвання народных мас у мастацкую творчасць.

Важнае месца сярод кампанентаў мастацка-вобразнай выразнасці народнага свята займае слова, якое выконвае рознабаковыя функцыі і выступае сродкам актывізацыі масавай імправізацыйнай творчасці ўдзельнікаў свята. Таму для ўдасканалення практыкі нацыянальнай святочнай культуры існуе неабходнасць паглыбленага даследчага пазнання размоўнага жанру ў народным свяце: яго вытокаў і гісторыі развіцця, прагрэсіўных традыцыйных форм.

Як паказвае гістарычная практыка, у народных гульнявых формах у традыцыйнай канве падзейразвівалася імправізацыйная творчасць народных мас, пабудаваная на прамым узаемадзеянні выканаўцаў і гледачоў. Такі від творчых зносін садзейнічаў адказнаму дзеянню гледача, ператвараючы яго ў актыўнага творчага ўдзельніка і разбураючы гэтым самым (або зводзячы да мінімуму) мяжу паміж выканаўцамі і гледачамі дзеяння.

Такім чынам, адной з характэрных рыс народных свят з'яўляецца імправізацыйная творчасць яго ўдзельнікаў, і праяўляецца яна ва ўсёй структуры народнага свята - абрадава-рытуальных, драматычных і гульнявых дзеяннях.

Імправізацыя ў народных святах засноўваецца на форме вуснай перадачы мастацкага вопыту праз пакаленні. Таму выкананне па памяці цягнула за сабой падсвядомыя ці свядомыя змены пачутага або ўбачанага твора.

Аналіз матэрыялаў па народнаму мастацтву дае падставы для вываду, што існавалі два віды імправізацыі: падрыхтаваная і непадрыхтаваная.

Падрыхтаваная імправізацыя ставіла сваёй мэтай уцягнуць у канкрэтназапланаванае дзеянне гледачоў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ненадрыхтаваная імправізацыя ўзнікала ў выніку змены ходу дзеяння, унясення ў яго нечаканасці і ярчэй за ўсё выяўлялася ў кірмашовых рэкламах тавару, у варажбе. Моўная рэакцыя ўдзельнікаў у час гэтых дзеянняў была непрадказальная.

Аналіз гістарычнага развіцця моўнага жанру ў народным свяце сведчыць аб тым, што імправізацыя з'яўляецца адметнай рысай народнага свята і бярэ свой пачатак у старажытнасці.

Гэта пацвярджае імправізацыйны характар апавяданняў казачнікаў, выступленняў лідэраў карагодаў у абрадавых рытуалах, скамарохаў, валачобнікаў, батлеечнікаў.

Такім чынам, праблема імправізацыі ў размоўным жанры сучасных народных свят застаецца адной з галоўных, і яе вырашэнне з'яўляецца важнай задачай для рэжысёра (або вядучага) народнага свята, рытуалу, абраду.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ